# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЗАХАВАННЯ «НЯСВІЖСКІХ» ПАРТРЭТАЎ СА ЗБОРУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**С. Э. Чавус,** *малодшы навуковы супрацоўнік*
*Нацыянальнага мастацкага музея*
*Рэспублікі Беларусь*

Творы беларускага гістарычнага партрэта з Нясвіжскага палаца паступілі ў Дзяржаўную карцінную галерэю падчас нацыяналізацыі культурных каштоўнасцей у 1939 г.

Менавіта знаходзячыся ў музейным зборы, яны сталі актыўна вывучацца. Даследчыкамі былі вызначаны іх мастацкая, гістарычная, мемарыяльная і іншыя якасці. Перастаўшы адыгрываць утылітарную ролю, яны набылі музейную каштоўнасць.

Вывучэннем «сармацкага» партрэта са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь займаліся супрацоўнікі гэтай установы Т. А. Карповіч, Н. Ф. Высоцкая, А. А. Ярашэвіч і інш.: творы ўводзіліся ў навуковы абыходак, была праведзена (і працягваецца сёння) праца па іх атрыбуцыі.

У 1981 г. у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР адбылася выстава «Другое нараджэнне партрэтаў з Нясвіжа і Гродна». У працэсе яе падрыхтоўкі была праведзена праца па рэстаўрацыі і вывучэнні твораў партрэтнага жывапісу з Нясвіжскай рэзідэнцыі князёў Радзівілаў. Выстава стала знакавай падзеяй – фактычна новым этапам у даследаванні беларускага гістарычнага партрэта. У выніку наведвальнікам музея былі паказаны некалькі дзесяткаў твораў XVII–XVIII стст.; з’явіўся змястоўны каталог, у якім публікавалася больш за 40 партрэтаў; Т. А. Карповіч, Н. Ф. Высоцкая падрыхтавалі шэраг артыкулаў, якія тычыліся дадзенай тэматыкі [4, с. 5].

У далейшым палотны неаднаразова дэманстраваліся на розных выставах: «Гістарычны партрэт Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў» 2003 г., [4], «Нясвіжскія зборы Радзівілаў» 2004, «Партрэты з Нясвіжскай калекцыі Радзівілаў» 2005 г. [3].

Сёння творы беларускага гістарычнага партрэта займаюць значнае месца ў пастаяннай экспазіцыі музея, праводзіцца праца па іх атрыбуцыі і рэстаўрацыі. На падставе Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» плануецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўнесці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь 65 партрэтаў [6].

Нягледзячы на тое, што ў музейным зборы творы партрэтнага жывапісу даўняй Рэчы Паспалітай інвентарызаваны пад нумарамі калекцыі ЗЖ – «Заходнееўрапейскі жывапіс», фактычна яны ўтвараюць асобную калекцыю. Згодна з Законам «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», тэрмін *«калекцыя»* вызначаецца як *навукова абгрунтаваны збор рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей або эталонаў фіксаваных нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей* [1].

На наш погляд, варта звярнуць увагу на тое, што калекцыя беларускага гістарычнага партрэта з Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь – гэта гістарычна сфарміраваны комплекс твораў, багацейшы збор у краіне, які ўсебакова і цэласна адлюстроўвае працэс развіцця партрэтнага мастацтва на беларускіх землях Рэчы Паспалітай. Значную і неад’емную частку яго складаюць палотны, якія паходзяць з нясвіжскай рэзідэнцыі князёў Радзівілаў.

Паводле Закона «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», забеспячэнне цэласнасці калекцый – гэта кірунак дзейнасці музея (арт. 12), а таксама адзін з асноўных яго абавязкаў (арт. 14) [4].

На сённяшні дзень, калі гаворка вядзецца аб перадачы значнай колькасці твораў гістарычнага партрэта Рэчы Паспалітай са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь у Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» дзеля доўгатэрміновага выкарыстання (экспанавання), актуальным з’яўляецца пытанне недапушчэння пагаршэння фізічнага стану партрэтаў.

Упершыню 16 партрэтаў з Дзяржаўнага мастацкага музея БССР паступілі на рэстаўрацыю на працягу 1963–1967 гг. З 1968 г. вялася планамерная праца па рэстаўрацыі твораў, якія паходзяць з Нясвіжа.

А. Б. Брындараў, мастак-рэстаўратар жывапісу вышэйшай кваліфікацыі, супрацоўнік Дзяржаўнага Рускага музея, які ўдзельнічаў у аднаўленні палотнаў, адзначаў, што «нясвіжскія» партрэты знаходзіліся ў надзвычай кепскім стане. Яны мелі вялікую колькасць механічных пашкоджанняў: шматлікія зломы палатна, грунту, страты аўтарскага фарбавага слоя. Адмоўную ролю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адыграла непрафесійная «антыкварная» рэстаўрацыя, якая была праведзена ў XIX – пачатку XX ст., у выніку чаго аўтарскі жывапіс быў запісаны, дубліроўка палатна была выканана на нізкім тэхнічным узроўні [5, с. 17].

Падчас рэстаўрацыі партрэты былі зняты з дэфармаваных, зацвілых дошак, большасць з іх раздубліраваны, падрыхтаваны да дубліроўкі і дубліраваны зноў на новае палатно [5, с. 18].

Зразумела, што ў выніку такога шырокага ўмяшальніцтва партрэты могуць быць захаваны толькі пры пастаянным аптымальным тэмпературна-вільготнасным і светлавым рэжымах і патрабуюць рэгулярнага кантролю свайго стану з боку рэстаўратараў. Шэраг партрэтаў знаходзяцца ў нездавальняючым стане, і перспектыва іх транспартыроўкі выклікае сур'ёзную занепакоенасць у рэстаўратараў (што адзначалася на рэстаўрацыйнай радзе ў НММ). Некаторыя партрэты (партрэт Януша Радзівіла пэндзля Даніэля Шульца – 1650-я гг., партрэт Станіслава Аўгуста Панятоўскага пэндзля Юзафа Ксаверыя Гескага – 1783 г.) на сённяшні дзень знаходзяцца ў працэсе рэстаўрацыі.

Такім чынам, перадача партрэтаў у Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» можа адбыцца толькі пасля стварэння адпаведных умоў для іх транспарціроўкі і экспанавання.

Паводле Закона «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (арт. 18), *забараняецца выкарыстанне музейных прадметаў і музейных калекцый ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванню і (або) могуць прывесці да іх пашкоджання, страты ці знішчэння. У мэтах забеспячэння захавання музейных прадметаў і музейных калекцый і выключэння выпадкаў іх пашкоджання, страты ці знішчэння ў музеях устанаўліваецца навукова абгрунтаваны спецыяльны рэжым захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, праводзяцца іх кансервацыя і (або) рэстаўрацыя* [2].

Натуральна, што партрэты князёў Радзівілаў – важная дэталь пры адлюстраванні гісторыі гэтага знакамітага магнацкага роду, аднак не менш важныя яны і пры паказе гісторыі станаўлення нацыянальнага жывапісу. Таму і Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», і Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь прыводзяць слушныя аргументы ў спрэчцы аб перадачы твораў. Зыходзіць у гэтай сітуацыі варта з прынцыпаў забеспячэння захаванасці і цэласнасці ўнікальнай калекцыі. Гэта дапаможа не дапусціць былых памылак, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прывялі да таго, што колішняя радзівілаўская калекцыя партрэтнага жывапісу сёння падзелена паміж некалькімі ўстановамі краіны, а 87 твораў увогуле падараваныя Польшчы.

Адзначым таксама наяўнасць пэўнай колькасці памылак у «тэматыка-экспазіцыйных планах другога пускавога комплексу палацавага ансамбля Радзівілаў у г. Нясвіжы», якія тычацца выкарыстання партрэтнага жывапісу (пры сцвярджэнні вялікай значнасці партрэтаў для экспазіцый палаца). Заўвагі былі выказаны на пасяджэннях рабочай групы па музеефікацыі Нясвіжскага палаца. Супрацоўнікі Мастацкага музея прапанавалі «Уточнения к тематической структуре и ТЭП 2008–2009 гг.». Урэшце вялікая колькасць памылак была выпраўлена [8].

Аднак і на сёння ў ТЭПах ёсць пэўная колькасць недакладнасцей. Так, плануецца размясціць у палацы рэканструкцыю інтэр'ера каталіцкай капліцы. У экспазіцыю, побач з партрэтамі Рымскіх Папаў Клімента XI і Пія V, кардынала Яна Аляксандра Ліпскага і абатысы нясвіжскага кляштара бенедыктынак Крысціны Яўфіміі Радзівіл, плануецца змясціць партрэт уніяцкага Кіеўскага мітрапаліта Кіпрыяна Жахоўскага [7].

Нягледзячы на тое, што ў палацы мяркуецца стварыць асобную экспазіцыю, дзе будуць змешчаны партрэты вядучых палітычных дзеячаў: аўстрыйскага імператара Леапольда I, вялікага князя літоўскага і польскага караля Уладзіслава IV Вазы (гэты партрэт пазначаны ў музейным зборы як «Невядомы з карункавым каўнерам»; перад тым, як сцвярджаць, хто адлюстраваны на партрэце, неабходна правесці навукова-даследчую работу па атрыбуцыі твора), каралёў Аўгуста III і Яна III Сабескага, партрэт апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, паводле ТЭПу, размяшчаецца ў Тэатральнай зале на трэцім паверсе арсенала. Пры тым што плошча дадзенага памяшкання, у якім будзе знаходзіцца толькі адзін партрэт, – 210 м.кв., экспазіцыя заяўлена як «ансамблевая» [7].

Адзіны партрэт – Юрыя Ежы Радзівіла – плануецца ўключыць таксама ў экспазіцыю «Залатая зала» (плошча памяшкання 111 м. кв.). Але праблема яшчэ і ў тым, што дадзены партрэт размяшчаўся ў іншым памяшканні – Малой сталовай зале, пра што сведчаць фотаздымкі пачатку XX ст. А менавіта па гэтых фотаздымках, як заяўлена ў ТЭПе, і будзе аздоблены інтэр'ер дадзенага памяшкання (інтэр'ер быў адноўлены ў XIX ст. па загаду Марыі дэ Кастэлян) [7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле ТЭПаў музея-запаведніка «Нясвіж», у экспазіцыю павінны ўвайсці 22 партрэты з Мастацкага музея, у той жа час запрошаны для экспанавання больш за 30 партрэтаў [7].


1. *Закон* Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», студз. 2006 г., № 98-З [Электронны рэсурс]. – URL: www.spadczyna.org.

2. *Закон* Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», 12 снеж. 2005 г., № 70-З [Электронны рэсурс]. – URL: http:pravo.by.

3. *Аддзел* старажытнабеларускага мастацтва // Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – 2006–2010. – URL: http://artmuseum.by/by/aboutmuseum/otd/dbi.

4. *Гістарычны* партрэт Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стагоддзяў: каталог выставы / Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі; укл. І. М. Зварыка. – Мінск: Юніпак, 2003. – 106 с.

5. *Другое* нараджэнне партрэта з Нясвіжа і Гродна: каталог / Дзяржаўны мастацкі музей БССР; уступ. арт.; скл. Т. А. Карповіч; пад. рэд. І. М. Паньшынай. – Мінск: Беларусь, 1981. – 112 с.

6. *Прапанова* да надання статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці творам гістарычнага партрэта Беларусі са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (2011 г.) // Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.

7. *Тэматыка*-экспазіцыйныя планы другога пускавога комплексу палацавага ансамбля Радзівілаў у г. Нясвіжы (2011 г.) // Нацыянальны гісторыка- культурны музей-запаведнік «Нясвіж».

8. *Уточнения* к тематической структуре и ТЭП (тематико-экспозиционным планам) 2008–2009 гг. // Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ